АКЦЫІ

# ЧЫТАЕМ НА КАНІКУЛАХ



**На вясновых канікулах вучні 5 і 6 класаў Скрыбаўскай сярэдняй школы Шчучынскага раёна стварылі анлайн-праект «Чытаем вершы сучасных паэтаў Гродзеншчыны».**

Праект быў прымеркаваны да тыдня дзіцячай кнігі. Падчас складанай эпідэміялагічнай сітуацыі дзеці вырашылі адзначыць свята менавіта такім чынам – у анлайн-фармаце. А натхніла на гэтую справу сваіх вучняў настаўніца беларускай мовы і літаратуры Наталля Лявонаўна Цвірко, якая з'яўляецца членам Саюза пісьменнікаў Беларусі, аўтарам шматлікіх публікацый у СМІ і сецiве Інтэрнэт, пераможцай літаратурных конкурсаў, удзельнікам праектаў, а таксама аўтарам уласнай кнігі вершаў.

Безумоўна, вучні разам з настаўніцай зрабілі прыемны падарунак калектыву Гродзенскага абласнога аддзялення СПБ, а таксама ўсім аматарам сучаснай айчыннай літаратуры.

З выступленнямі скрыбаўскіх школьнікаў, за якія яны ўганараваны падзячнымі лістамі Саюза пісьменнікаў Беларусі, можа пазнаёміцца самая шырокая інтэрнэт-аўдыторыя. Выказваем шчырую ўдзячнасць юным чытальнікам і, зразумела, іх настаўніку – арганізатару акцыі, беларускай паэтэсе Наталлі Цвірко.

---

**Анлайн-праект «Чытаем вершы сучасных паэтаў Гродзеншчыны».**
Змест:

1.Таццяна Сучкова. «Гуляе вясна» – чытае вучань 6 класа Страшэўскі Іван: https://youtu.be/1LF4R6z7p6E
2.Таццяна Сучкова. «Вясна ў лесе» – чытае вучаніца 6 класа Літкоўская Лізавета: https://youtu.be/154B8WZra5E
3.Ірына Войтка. «Вясновы верш» – чытае вучаніца 5 класа Песцярняк Вікторыя: https://youtu.be/621Y-JoaKSI
4.Вікторыя Смолка. «Вясновае» – чытае вучаніца 5 класа Арлоўская Карына: https://youtu.be/YdD-ZRBGUH4
5.Людміла Кебіч. «Выклік зіме» – чытае вучаніца 6 класа Шчатко Вікторыя: https://youtu.be/g_-ZFB4E-OM
6.Наталля Цвірко. «Вясна» – чытае вучань 6 класа Цвірко Раман: https://youtu.be/-JZMfekzZRQ
7.Віктар Курловіч. «Надыход вясны» – чытае вучаніца 6 класа Макара Ксенія: https://youtu.be/19Og1ktOUlA

Удзельнікі праекта:



**Макара Ксенія**



**Страшэўскі Іван**



**Шчатко Вікторыя**




**Песцярняк Вікторыя**



**Літкоўская Лізавета**



**Цвірко Раман**



**Арлоўская Карына**



**Кіраўнік праекта, педагог, паэтэса Наталля Цвірко**

Калі ласка, глядзіце выступленні юных чытальнікаў-удзельнікаў анлайн-праекта «Чытаем вершы сучасных паэтаў Гродзеншчыны» на сайце www.pisateli.by і ў нашых сацыяльных сетках.

***ПРЭС-СЛУЖБА СПБ-ГРОДНА***
*Шчучынскі раён*